**Бібліяграфічны спіс**

1. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт: да 75-годдзя з дня заснавання БДУ / Беларус. дзярж. ун-т / рэдкал.: П. Д. Кухарчык, А. І. Зелянкоў, А. І. Лесніковіч. – Мінск, 1996. – 65 с.
2. Дарагакупец, А. М. «Не закапайце ў зямлю вашых дараў, а прымнажайце і аддайце іх народу...»: Якуб Колас і яго педагагічная дзейнасць у БДУ / А. М. Дарагакупец // Беларус. літаратуразнаўства: навук.-метад. зб. / гал. рэд. Л. Д. Сінькова. – Мінск: БДУ; Паркус плюс, 2010. – Вып. 8. – С. 138–146.
3. Іофе, Э. Якуб Колас – выкладчык вышэйшай школы / Э. Іофе // Адукацыя і выхаванне. – 1994. – № 12. – С. 91–95.
4. Летапіс жыцця і творчасці // Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 2003. – Т. 9, кн. 2: Дапаўненні да папярэдніх тамоў; Летапіс жыцця і творчасці; Дадатак. – С. 43–282.
5. Мушынскі, М. І. Летапіс жыцця і творчасці Якуба Коласа / М. І. Мушынскі; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск: Беларус. навука, 2012. – 1126 с.
6. Літаратуразнаўцы БДУ пра Якуба Коласа / падрыхт. А. І. Бельскі, У. Ю. Верына // Народныя паэты і пісьменнікі Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://narbel.bsu.by › litaratur... – Дата доступу: 11.09.2022.
7. Літаратуразнаўцы БДУ пра Янку Купалу / падрыхт. А. І. Бельскі, Г. М. Мятліцкая // Народныя паэты і пісьменнікі Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://narbel.bsu.by › litaratur... – Дата доступу: 11.09.2022.
8. Навукова-педагагічная дзейнасць Якуба Коласа ў 20–30-я гг. / Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: www.kolasmuseum.by › navu... – Дата доступу: 25.02.2021.
9. Памяць і слава: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 1921–1941 / склад.: С. М. Ходзін, М. Ф. Шумейка, А. А. Яноўскі; рэдкал.: В. І. Стражаў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2006. – 383 с.
10. Рагойша, В. П. Янка Купала і Якуб Колас у іх сувязях з Беларускім дзяржаўным універсітэтам (хроніка) / В. П. Рагойша, К. Р. Хромчанка // Народныя песняры: да 90-годдзя з дня нарадж. Я. Купалы і Я. Коласа: зб. артыкулаў / пад рэд. І. Я. Навуменкі [і інш.]. – Мінск: Выд-ва БДУ імя У. І. Леніна, 1972. – С. 262–271.
11. Універсітэт паэтычны / рэдкал.: А. А. Волк [і інш.]; склад. А. А. Лойка. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1971. – 244 с.
12. Янка Купала: энцыкл. / рэдкал.: У. У. Андрыевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн імя П. Броўкі, 2017. – Т. 1: А–З. – С. 112–113.


*УДК 378.4(476.6):821.161.3*

# ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ – АДЗІН З ЦЭНТРАЎ КУПАЛАЗНАЎСТВА

**М. У. Грынько**

*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы*
*Гродна, Рэспубліка Беларусь*
*ngrynko@mail.ru*

У артыкуле асвятляецца дзейнасць Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы як аднаго з цэнтраў купалазнаўства. Звяртаецца ўвага на мерапрыемствы, якія звязаны з ушанаваннем памяці народнага паэта Беларусі. Паказваюцца асноўныя кірункі даследавання творчасці пісьменніка ва ўніверсітэце.

*Ключавыя словы:* Янка Купала; Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы; купалазнаўства; Купалаўскія чытанні.

# STATE UNIVERSITY OF GRODNO – ONE OF THE CENTERS OF KUPALA STUDIES

**M. U. Hrynko**

*Yanka Kupala State University of Grodno*
*Grodno, Republic of Belarus*
*ngrynko@mail.ru*

The article deals with the activities of Yanka Kupala State University of Grodno as one of the centers of Kupala studies. Special attention is paid to activities related to commemoration of the memory of the national poet of Belarus. The main directions of research of the writer's work at the university are shown.

*Key words:* Yanka Kupala; Yanka Kupala State University of Grodno; Kupala studies; Kupala readings.

Увагу да сваёй асобы і творчасці Янка Купала звярнуў ледзь не з першых публікацый, якія з'яўляліся ў перыядычным друку, пераважна ў знакавай газеце для пачатку ХХ стагоддзя «Нашай ніве».

Адну з найбольш яркіх ацэнак творчасці пісьменніка сустракаем у артыкуле Максіма Багдановіча «Глыбы і слаі», напісаным у 1911 годзе: «…Як і ў 1909 гаду, найбольш увагі звяртае на сябе Я. Купала; звяртае не толькі велічынёй сваёй здольнасці, але гібкасцю яе, здатнасцю да ўсестаронняга развіцця. Гэта бадай адзіны наш пісьменнік, каторы ідзе ўперад, вядзе нейкую ўнутраную працу, і, зрабіўшы ці мала, не супыняецца аж да гэтага часу» [1, с. 270].

Пра жыццё і творчасць Песняра напісана багата манаграфій, вялікая колькасць навуковых артыкулаў, прысвечана мноства твораў розных відаў мастацтва. Сёння беларускі чытач мае магчымасць пазнаёміцца з трыма варыянтамі поўнага збору твораў пісьменніка, трохтомнай энцыклапедыяй «Янка Купала». Дарэчы, у названым энцыклапедычным выданні найперш увагу звяртае артыкул «Гродна» [2, с. 264–266].

На працягу 82-гадовага існавання Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта заўжды была ўвага да асобы класіка. Так, адразу ж пасля таго, як імя Янкі Купалы было прысвоена Гродзенскаму педагагічнаму інстытуту, распачынаюцца Купалаўскія чытанні, на якіх з розных бакоў аналізуецца жыццёвы шлях і багатая творчая спадчына пісьменніка.

Найперш варта акцэнтаваць увагу на 12 выданнях чытанняў, якія з 1995 года рэгулярна ладзяцца ва ўніверсітэце адзін раз на два гады.

Зборнікі матэрыялаў ці навуковыя артыкулы па выніках Купалаўскіх чытанняў – своеасаблівая справаздача літаратуразнаўцаў, мовазнаўцаў, культуролагаў, а таксама праваднік, падказка, якія тэмы купалазнаўства найбольш актуальныя ў той ці іншы перыяд развіцця навукі ў прыватнасці і краіны ў цэлым. Так, адной з асноўных «адроджаных» тэм Купалаўскіх чытанняў у 90-х гадах мінулага стагоддзя стала тэма станаўлення Беларусі, пошук шляху развіцця маладой незалежнай краіны праз прызму творчасці класіка, што ўвасобілася ў такіх працах, як «Янка Купала як нацыянальная духоўная каштоўнасць» (1996), «Янка Купала і беларуская культура» (2000), «Янка Купала і нацыянальны культурны кантэкст» (2007) Аляксея Пяткевіча, «Сацыякультурныя заканамернасці нацыянальнага адраджэння і яго адметнасці ў кантэксце спадчыны Янкі Купалы» Мікалая Бяспамятных (1999) і інш.

Як вядома, адной з актуальных праблем купалазнаўства з'яўляецца вывучэнне жыццёвага шляху пісьменніка: даследуецца яго дзейнасць у пэўныя перыяды жыцця, асаблівую ўвагу біёграфаў Янкі Купалы выклікаюць нявысветленыя прычыны смерці класіка. Сапраўдным навуковым адкрыццём, якое выклікала вялікі рэзананс, стаў даклад, прачытаны прафесарам Іванам Лепешавым «Пра Купалавы песні з турмы» (2000), дзе даследчык, сабраўшы па крупіцах матэрыялы, якія так ці інакш звязаны з асобай Янкі Купалы, даводзіць, што смерць паэта наўрад ці насіла выпадковы характар.

Творчасць Янкі Купалы ўжо з першай паловы ХХ стагоддзя трывала замацавалася ў школьных праграмах па беларускай літаратуры. Таму метадычная навука заўжды знаходзіцца

ў пошуку актуальных метадаў, прыёмаў, шляхоў, тэхналогій, якія варта выкарыстоўваць пры вывучэнні мастацкай спадчыны пісьменніка як у сярэдняй, так і ў вышэйшай школе. Сярод даследчыкаў-метадыстаў вылучым імя заслужанай настаўніцы Беларусі, выкладчыка Купалаўскага ўніверсітэта Алены Руцкай, якая на кожных Купалаўскіх чытаннях прапаноўвала новыя падыходы да вывучэння жыцця і дзейнасці Янкі Купалы: «Праблемнае вывучэнне творчасці Янкі Купалы праз спалучэнне паўрочнай і пазакласнай работы» (1995), «Паглыбленне вывучэння творчасці Янкі Купалы праз інтэграваную пазакласную працу» (1999), «Вывучэнне творчасці Янкі Купалы ў 10 класе» (2000), «Выкарыстанне новых тэхналогій пры вывучэнні творчасці Янкі Купалы ў школе» (2003) «Выкарыстанне праектнай тэхналогіі пры вывучэнні драматургіі Янкі Купалы» (2007), «Спецыфіка выкарыстання новых форм урокаў пры вывучэнні творчасці Янкі Купалы» (2013) і інш.

Асобным праблемным полем Купалаўскіх чытанняў можна вылучыць тэарэтыка-метадалагічны аспект вывучэння творчасці Янкі Купалы, прадстаўлены найперш даследаваннямі доктара філалагічных навук Ігара Жука: «Анталагічнае ядро тутэйшых» (1999), «Аб адным выпадку “рытмавай рэдукцыі” ў паэзіі Янкі Купалы (верш “У дарозе”, 1918 г.)» (2000), «Ініцыятыўная метафара шляху ў драме Янкі Купалы “Раскіданае гняздо”» (1999), «“Магутнае слова ты, роднае слова”: амфібрахій у метрычнай сістэме ранняй купалаўскай лірыкі» (2010), «Матыўная спадчына Янкі Купалы: стан і перспектывы даследавання» (2015) і інш.

Ва ўсіх зборніках па выніках Купалаўскіх чытанняў звяртаецца ўвага на наступныя кірункі купалазнаўства: паэмная спадчына (С. П. Мусіенка, А. М. Петрушкевіч, С. М. Тарасава, Н. П. Чукічова і інш.), драматургія (І. В. Жук, І. Я. Лепешаў, А. М. Петрушкевіч і інш.), паэтыка Купалавага радка (І. В. Жук, А. Э. Сабуць, Н. Э. Шандроха і інш.), лінгвістычны аналіз творчай спадчыны Янкі Купалы (М. А. Даніловіч, З. П. Данільчык, І. Я. Лепешаў, В. В. Маршэўская, А. С. Садоўская, М. А. Якалцэвіч і інш.).

У 2006–2008 гг. супрацоўнікамі кафедры беларускай літаратуры выконвалася тэма Беларускага фонду фундаментальных даследаванняў «Лейтматывы ў беларускай літаратуры XX стагоддзя: гістарычны рух, рэгіянальная трансфармацыя, культуралагічны кантэкст» (навуковы кіраўнік – доктар філалагічных навук І. В. Жук), адным з вынікаў якой стала манаграфія «Матыўная прастора беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя», якая ўбачыла свет у 2009 годзе. Значная частка даследаванняў у манаграфіі прысвечана творчасці Янкі Купалы: «Матыў бяседы-вяселля ў ранніх паэмах Янкі Купалы», «Матыў балю, бяседы-вяселля ў фальклорна-рамантычных паэмах Янкі Купалы», «Фальклорны матыў бяседы-вяселля ў драматычных творах Янкі Купалы», «Янка Купала: асаблівасці паэтыкі шляху», «Дарожны трыпціх Янкі Купалы: “А хто там ідзе?” – “У дарозе” – “Паязджане”».

Знакавай з’явай у беларускім літаратуразнаўстве стаў выхад з друку ў 2017 г. манаграфіі Ігара Жука «Прыхінуцца да крыніцы» (на вялікі жаль, кніга выдадзена пасля смерці аўтара, дзякуючы намаганням родных, калег і вучняў). «“Прыхінуцца да крыніцы”, – як сцвярджаецца ў анатацыі, – “глыбокае і ўдумлівае даследаванне тэмы і матыву беларускага шляху ў паэтычнай спадчыне Янкі Купалы і Якуба Коласа, асэнсаванне выключнай значнасці гэтай тэмы ў станаўленні нацыянальнай літаратуры». Адзін з двух раздзелаў манаграфіі – «“Шляхам жыцця” Янкі Купалы» – не што іншае, як новы, арыгінальны і глыбокі погляд на творчасць класіка. І кожны з трох трыпціхаў дадзенага раздзела – гутарка пра вялікага Беларуса, пра непераўзыдзеную творчасць класіка.

Да 135-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы (2017) навуковай бібліятэкай універсітэта створаны электронны бібліяграфічны ўказальнік «Янка Купала» (https://elib.grsu.by/doc/26047) (склад. Л. М. Алясюк, М. У. Грынько, І. І. Селюжыцкая), дзе пададзены прысвечаныя пісьменніку бібліяграфічныя звесткі пра навуковыя, метадычныя, папулярныя выданні, артыкулы, якія ёсць ў фондзе навуковай бібліятэкі. З чатырох раздзелаў указальніка назавём толькі адзін – «Купалаўцы пра Купалу» – раздзел, у якім сабрана інфармацыя пра працы, створаныя супрацоўнікамі ГрДУ імя Янкі Купалы.

У 2017–2018 гг. выдавецтвам «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» рэалізоўваўся ўнікальны для беларускай культурнай прасторы праект – выданне трохтомнай энцыклапедыі «Янка Купала», прысвечанае 135-годдзю з дня нараджэння народнага паэта. На адвароце

тытульнага ліста пазначана, што выданне падрыхтавана ў тым ліку сумесна з Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы. Звыш 40 энцыклапедычных артыкулаў напісана супрацоўнікамі нашага ўніверсітэта, а гэта: Д. М. Лебядзевіч, А. Э. Сабуць, Р. К. Казлоўскі, Т. Р. Сіманава, П. І. Маляўка, Н. Э. Шандроха, В. В. Маршэўская, М. А. Якалцэвіч.

Багатым на падзеі стаў юбілейны, 2022 год для ўніверсітэцкіх купалаўцаў. Разумеючы тую вялікую адказнасць за права насіць імя першага народнага паэта краіны, яны распрацавалі план мерапрыемстваў, прысвечаных юбілею Песняра. Спынімся на некаторых з іх.

Ужо традыцыйным стала падчас мерапрыемстваў, прысвечаных дню нараджэння ўніверсітэта і святкаванню Тыдня роднай мовы, напісанне агульнаўніверсітэцкай Купалаўскай дыктоўкі, фармат якой пастаянна мяняецца, а колькасць удзельнікаў пашыраецца. Так, напрыклад, у 2022 годзе да Купалаўскай дыктоўкі далучыліся ўдзельнікі курсаў беларускай мовы, якія дзейнічаюць у Цэнтры беларускай мовы, літаратуры і культуры пры філалагічным факультэце Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава і створаны сумесна з Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы. Таксама разам з «купалаўскай сям'ёй» дыктоўку пісалі супрацоўнікі Пасольства Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы.

У газеце «Гродзенскі ўніверсітэт» з'явілася асобная рубрыка, прысвечаная Янку Купалу. Так, ужо ў № 11 ад 29.12.2021 г. у артыкуле «Пад светлым іменем Купалы» падаецца анонс мерапрыемстваў на юбілейны год, указваецца спецыфіка арганізацыі працы па святкаванні 140-годдзя з дня нараджэння паэта. У кожным нумары газеты за 2022 год друкаваліся матэрыялы і артыкулы ў гонар Песняра: «Нам засталася спадчына» [пра ўшанаванне памяці Янкі Купалы ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце] (31.01.2022, аўтар – М. У. Грынько), «Універсітэт – цэнтр купалазнаўства» (22.02.2022, аўтар – М. У. Грынько), «Ідэал жаночай красы ў Купалавым светаразуменні» (20.03.2022, аўтар – А. Э. Сабуць), «Беларуская купаліяна ў літаратуры і кіно» (26.04.2022, аўтар – С. М. Тарасава), «Купалаўскімі сцяжынкамі пройдзем разам» (25.05.2022, аўтары – магістранты спецыяльнасці «Журналістыка»), «Купальскі пясняр» (29.06.2022, аўтар – М. Б. Пажарыцкі), «Адкрыць для сябе Беларусь» [пра Летнюю школу беларускай мовы і культуры «Пад светлым іменем Купалы»] (12.09.2022, аўтар – М. У. Грынько), «Янка Купала – за кафедрай кнігавыдачы» (12.09.2022, аўтар – М. Б. Пажарыцкі). Азнаёміцца з «купалаўскімі» матэрыяламі можна на сайце газеты https://gazeta.grsu.by/).

Сярод мерапрыемстваў адзначым наступныя: флэшмоб «Купалава слова гучыць па ўсім свеце» (чытаем вершы Купалы на розных мовах), квэст «Купалаў след у Alma-mater», літаратурна-музычная праграма «І не змоўкнуць ніколі Купалавы словы», літаратурная гасцёўня «У гасцях у Купалы» ў рамках праекта «Жывая гісторыя», акцыя «Купалаўская паштоўка»: да Дня беларускага пісьменства і інш. У межах традыцыйнага турзлёту супрацоўнікаў універсітэта, які сёлета меў назву «Купалле з Купалам», быў праведзены тэматычны дзень творчасці «Купальскі вянок». Для студэнтаў факультэта мастацтваў і дызайну быў арганізаваны плэнер у Вязынцы, па выніках якога рыхтуецца выстава.

Знакавым, на нашу думку, з'яўляецца падпісанне дамовы аб супрацоўніцтве паміж Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы і Дзяржаўным літаратурным музеем Янкі Купалы ў 2022 годзе.

Зазначым, што агульная каардынацыя дзейнасці па арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў ускладзена на навуковую бібліятэку як інфармацыйны і сацыякультурны цэнтр універсітэта.

Як бачна з невялікага агляду, творчая спадчына першага народнага паэта Беларусі, яго жыццёвы лёс – актуальная тэма даследаванняў купалаўцаў, тых, хто з гонарам носіць імя класіка, навучае і навучаецца дзякуючы несмяротнай спадчыне вялікага паэта, што дазваляе гаварыць аб Гродзенскім дзяржаўным універсітэце як адным з цэнтраў купалазнаўства.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Багдановіч, М. Выбраныя творы / М. Багдановіч. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 1996. – 494 с.
2. Янка Купала: энцыкл. / рэдкал.: У. У. Андрыевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн імя П. Броўкі, 2017. – Т. 1: А–З. – С. 112–113.